М. ГАЛАДЗЕД.

## Міліцыі Беларусі да дзесятай гадавіны.

Пасьля таго, як пралетарыят у Кастрычніку 1917 г., скинуў айчынную буржуазею і ўзяў уладу ў свае рукі, перад ім паўстала беспасрэдная задача ўтрыманьня ўлады, на якую пакушалась скінутая буржуазея пры ўсебаковай падтрымцы чужаземных капіталістых. Клясы эксплёататараў (паны, фабрыканты) не маглі згадзіцца з тым, што ўціснуты вякамі рабочы і селянін аказаўся сам сабе гаспадар і уладар. Пагэтаму усе рэакцыйныя сілы аб'ядналіся супроць улады рабочых і сялян, супроць пралетарскай дыктатуры. Барацьба з Савецкаю ўладаю праводзілась (яна працягваецца і да гэтай пары) рознымі шляхамі, як узброеным наступам знадворку (чужаземная капіталістычная інтэрвенцыя), гэтак сама і шляхам арганізацыі ўнутры СССР контр-рэвалюцыйных змоваў, дыверсій, арганізацыі бандытскіх нападаў, забойства правадыроў рабочае клясы і г. д. **Задача барацьбы з унутранай контр-рэвалюцыяй і падтрыманьне рэвалюцыйнага парадку і ляжала на рабоча-сялянскай Міліцыі, якая з гонарам яе выконвала.** Цяжкі і адказны шлях Міліцыі ў ахове Кастрычнікавых завоеў ад ворагаў Савецкае ўлады. Пражытыя дзесяць гадоў поўныя бязупыннымі спробамі падрыву пралетарскае дзяржавы з боку контр-рэвалюцыі, яны так сама поўныя і бліскучымі вялікімі ўчынкамі рабочае клясы і работникаў Міліцыі на фронце аховы рэвалюцыйнага парадку, на фронце абароны рабочых і сялянскіх масаў ад злых элемэнтаў.

Умовы работы Міліцыі БССР вельмі цяжкія, адгэтуль і задачы, якія стаяць перад ёй, маглі быць выкананы толькі пры гігантцкай напружанасьці энэргіі і ўвагі, пры ўмове шчырай адданасьці сваёй справе—справе абароны Савецкае ўлады ад яе ворагаў. А ворагаў у Савецкай ўлады на тэрыторыі БССР была вельмі шмат у сілу яе тэрыторыяльнага разьмяшчэньня (мяжа з капіталістычнымі дзяржавамі). Трэба толькі ўспомніць, як Міліцыі БССР прыходзілася ня раз перабудоўваць

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы